УДК 378.035:808.26

Р. В. Міксюк, ст. выкладчык

# РОЛЯ ВЫКЛАДЧЫКА РОДНАЙ МОВЫ Ў ПАТРЫЯТЫЧНЫМ ВЫХАВАННІ МОЛАДЗІ

Advices concerning the students patriotic education are given in this article. The recommendations are taken from Belarusian language department experience in this field.

Углядаючыся ў мінулае, мы імкнемся зразумець значнае, убачыць перспектывы. Любоў да Бацькаўшчыны, патрыятызм – гэта не толькі важнейшая ўмова народаў, рашаючы маральны фактар паспяховага пераадолення цяжкасцяў, але і магутны духоўны сродак, здольны забяспечыць паступальнае сацыяльна-эканамічнае развіццё краіны сёння, дапамагае захаваць і павялічыць духоўныя каштоўнасці народа. У пасланні Прэзідэнта А. Г. Лукашэнкі Нацыянальнаму сходу і беларускаму народу 14 красавіка 2004 г. падкрэслена, што «важнейшы пастулат ідэалогіі беларускай дзяржавы – патрыятызм. У свеце ведаюць Беларусь як рэспубліку-партызанку, а беларусаў – як людзей з воляй, непахіснай у барацьбе з нацысцкай чумой».

Сутнасць патрыятызму па-рознаму трактавалася рознымі мысліцелямі. Сучасны слоўнік дае такое тлумачэнне: «патрыятызм – адданасць і любоў да сваёй айчыны, да свайго народа».

Адным з асноўных напрамкаў рэформы вышэйшай школы з’яўляецца ўзмацненне выхавання ў духу патрыятызму. На выкладчыка вышэйшай школы кладзецца вялікая адказнасць за фарміраванне гэтай рысы, працягваючы пачатае школай.

Выхаванне патрыятызму пачынаецца з паглыбленага пазнання сваёй Радзімы на канкрэтных прыкладах і на канкрэтных прадметах, а не на абстрактных паняццях доўгу.

Ужо з першых заняткаў беларускай мовы можа быць распачата праца па патрыятычным выхаванні. Напрыклад, даецца заданне запісаць у алфавітным парадку вядомыя ім прозвішчы знакамітых людзей Беларусі (асветнікаў, вучоных, мастакоў, кампазітараў, Герояў Савецкага Саюза і г. д.), пра якіх пазней будуць прагледжаны фільмы, напісаны рэфераты, зроблены вусныя выказванні.

Вельмі важна, каб на кожных занятках быў уключаны краязнаўчы матэрыял, выкарыстанне якога стымулюе пошукавую дзейнасць студэнтаў.

Знаёмячыся з тэмамі «Анамастыка як крыніца вывучэння этнічнай культуры беларусаў» і «Этнаграфія Беларусі», выкладчык мае магчымасць правесці шэраг творчых прац: студэнтам даецца заданне сабраць тапанімічныя назвы сваёй мясцовасці і прааналізаваць іх з боку этымалогіі; запісаць інтэрв’ю са старажыламі; падрыхтаваць невялікія паведамленні тыпу «Тапанімічныя легенды нашага краю», «Мікратапонімы майго раёна», «Гідраніміка Беларусі» і іншыя.

Родная краіна становіцца яшчэ больш блізкай і роднай, калі ведаеш яе гісторыю. Мэта працы выкладчыка – запаліць у вачах моладзі агонь гонару за свой край, за слаўныя перамогі, за яго выдатных сыноў.

Выхаванне патрыятызму не можа быць адарваным, не звязаным з каранямі мінулага, якое з’яўляецца прамой спадчынай творчых спраў прадзедаў, апірышчам далейшага развіцця краіны ў новых гістарычных умовах.

Да 60-годдзя Вялікай Перамогі, і не толькі да юбілею, трэба ствараць экспазіцыі ці альбомы тыпу «Нашы землякі – героі фронту і тылу», «Лёс маёй вёскі ў час Вялікай Айчыннай вайны», «Іх імёнамі названы вуліцы», «Запісы ўспамінаў землякоў» і падобныя.

Разгляд тэмы «Гераічная Беларусь» лепш правесці ў форме віктарыны, дзе пытанні могуць быць не толькі славесныя, але і ў выглядзе фрагментаў фільмаў, слайдаў, манументальных выяў, ілюстрацый і іншай нагляднасці, што дае магчымасць шырока пазнаёміцца са старонкамі гераічнага мінулага Беларусі. Больш значным ў выхаванні патрыятызму моладзі сталі пазаўрочныя мерапрыемствы, такія як экскурсіі ў Музей Вялікай Айчыннай вайны, паездкі па месцах баявой славы, сустрэчы з ветэранамі вайны.

У шэрагу літаратурных твораў ваеннай тэматыкі востра ставіцца пытанне пра антыгуманную сутнасць вайны, якая забірае мільёны чалавечых жыццяў, калечыць лёсы, пазбаўляе людзей шчасця жыцця. Варты ўвагі прагляд кінафільмаў па творах В. Быкава «Альпійская балада», Б. Васільева «А зоры тут ціхія», А. Адамовіча «Ідзі і глядзі» і іншыя.

З кожным годам усё менш і менш становіцца сведак вайны, і ўсё менш магчымасці пагаварыць з імі моладзі. Аднак дзякуючы пісьменнікам І. Калесніку, А. Адамовічу, Я. Брылю і іх дакументальнай кнізе «Я – з вогненнай вёскі» можна пазнаёміцца са сведчаннем людзей, што выпадкова ўцалелі ў час расправы карнікаў. Гэтыя людзі літаральна выйшлі з полымя і брацкіх магіл. Іх памяць – страшэнная памяць. А. Адамовіч часта паўтараў словы К. Сіманава, што «усёй праўды пра вайну адзін пісьменнік ведаць не можа, яе ведае толькі народ». У сваіх творах «Карнікі» і «Хатынская аповесць» А. Адамовіч стараўся быць верным гэтаму за-

павету. На дакументальным матэрыяле напісана і аповесць В. Казько «Суд у Слабадзе», дзе расказваецца пра трагедыю падлетка Лецечкі, у якога ў час вайны немцы бралі кроў для раненых. Лецечка асуджаны на павольную смерць. Аповесць, якая асуджае бесчалавечнасць фашызму, павінна выклікаць у сённяшняй моладзі нянавісць да антычалавечай сутнасці фашысцкай ідэалогіі.

Сапраўдны патрыятызм асацыіруецца з агульначалавечымі ідэаламі. «Любовь к Отечеству должна быть вместе с любовью к человечеству…» – казаў В. Г. Бялінскі. Брацкая дружба народаў асабліва ярка праявілася ва ўмовах барацьбы з фашызмам. Яркае сведчанне таму – адлюстраванне ваеннага часу ў літаратурных творах М. Танка, П. Панчанкі, К. Сіманава, М. Джаліля, В. Быкава і іншых. Выкладчыку толькі трэба выбраць найбольш яркае і ўмела ўключыць матэрыял у канву заняткаў. Напрыклад, пры вывучэнні тэмы «Сучасная беларуская літаратура» неабходна ўзгадаць пра пісьменнікаў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, а таксама пра тых, хто ваяваў і застаўся ў жывых. Вось яркі прыклад з жыцця беларускага пісьменніка Рыгора Няхая. Каб зацікавіць студэнтаў, неабходна зрабіць такі ўступ: «У снежні 1945 года на пленуме Саюза пісьменнікаў Беларусі ўшаноўвалі памяць беларускіх літаратараў, якія загінулі на франтах Вялікай Айчыннай вайны, у партызанскіх атрадах і ў складзе антыфашысцкага падполля. Тады на гэтай жалобнай пераклічцы прагучала імя – Рыгор Няхай. У прыціхлай зале нечакана хтосьці сіплым пракураным голасам азваўся: «А я тут!..» Усе аглянуліся. Каля дзвярэй стаяў малады мужчына-артылерыст у заношаным, прапаленым шынялькy…

За плячыма беларускага паэта, аўтара зборніка паэзіі «Па сонечных узгорках» Рыгора Няхая было амаль чатыры вогненныя гады. І не адзін раз ад смерці яго выратоўваў… толькі цуд.» Я лічу, што легендарная біяграфія, біяграфія франтавіка, камандзіра партызанскага атрада, разведчыка, падпольшчыка і зноў… франтавіка, не толькі заінтрыгуе студэнтаў, але і выкліча жаданне даведацца пра яго творы. Папярэдне можна даць заданне 2–3 студэнтам падрыхтаваць паведамленні пра жыццёвы і творчы шлях Рыгора Няхая. На наступных занятках узгадаць пра ваенны лёс В. Быкава, імя якога высечана на адным з абеліскаў, пра А. Куляшова і іншых.

Можна, напрыклад, правесці аналіз вершаў, у якіх узгадваюцца падзеі вайны, на якіх можна выхоўваць мужнасць, патрыятызм, інтэрнацыяналізм маладога пакалення. Напрыклад, у вершы А. Куляшова «Над брацкай магілай» паўстае эпізод суровага франтавога жыцця. Пасля чарговага бою з ворагам воіны хаваюць сваіх баявых сяброў. Пад Старою Русаю ў рускай вёсцы Лажыны загінулі беларускія хлопцы. Гэта зямля была для іх такой жа дарагой, як і зямля Беларусі. Воіны адстойвалі яе ад ворага з такой жа мужнасцю, з якой за беларускія вёскі змагаліся рускія воіны і сыны іншых народаў. У вершы гучыць тэма франтавога брацтва, тэма дружбы савецкіх народаў, якая вытрымала ў тыя грозныя дні самае суровае выпрабаванне – выпрабаванне агнём вайны.

Пры абагульненні тэмы падкрэсліваецца, што вялікую ролю ў справе перамогі над ворагам адыграла дружба народаў нашай краіны.

Знойдзецца месца ў тэме «Нацыянальныя меншасці ў Беларусі», каб пагутарыць пра патрыятызм і інтэрнацыяналізм. Узняўшы праблему адносін да вайны людзей розных нацыянальнасцяў, якія насялялі нашу краніну, студэнты прыходзяць да вываду, што людзі розных нацыянальнасцяў былі патрыётамі адной радзімы. Узнік і новы тэрмін – савецкі патрыятызм – патрыятызм новага тыпу, які зліваўся з пралетарскім, сацыялістычным інтэрнацыяналізмам.

Такім чынам, узнікае новае пытанне: што такое інтэрнацыяналізм? Праводзіцца дыскусія, пасля якой студэнты разумеюць, што быць інтэрнацыяналістам – значыць паважаць кожную нацыянальнасць. Нацыянальная палітыка партыі дала магчымасць падняць усе народы нашай краіны на змаганне з ворагам. Гэта здзіўляла нават ворага.

Не трэба забываць і нацыянальны гонар, які абапіраецца на лепшыя традыцыі народаў, на традыцыі прагрэсіўных, вызваленчых рухаў і спалучае ў сабе патрыятызм з інтэрнацыяналізмам. Не ганарыцца сваёй нацыянальнасцю таксама нельга, бо ты ж сын свайго народа, ты ганарышся мінулым свайго народа, ты нашчадак творчых спраў свайго народа.

Не меншую ролю адыгрывае ў выхаванні патрыятызму і нянавісці да войнаў музычнае і выяўленчае мастацтва, па якіх студэнты пішуць рэфераты. Паказ серыі карцін М. Савіцкага «Лічбы на сэрцы», прагляд і аналіз плакатаў ваеннай пары, напісанне сачынення па карціне Волкава «Брэсцкая крэпасць», праведзеная віктарына «Песні ваенных гадоў» нагадваюць не толькі пра мастакоў, кампазітараў і аўтараў песень, але і змест твораў, дзе перадаецца жыццё, мужнасць, вернасць людзей, іх духоўны стан.

Шмат інфармацыі дае агляд тэмы «Перыядычны друк», дзе пэўнае месца займае раздзел «Перыядычны друк на Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны». З першых дзён і да канца вайны друк Беларусі інфармаваў аб становішчы на франтах, аб гераічнай барацьбе Чырвонай Арміі, разгортванні партызанскага руху, клікаў

на барацьбу з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, усяляў веру ў перамозе над ворагам, вёў антыфашысцкую агітацыю і прапаганду, паведамляў пра злачынствы акупантаў і іншае. Каб пазнаёміць з пэўнымі выданнямі, можна прапанаваць кожнаму студэнту ўлётку з назвай газеты («Савецкая Беларусь», «За Савецкую Беларусь», «За свабодную Беларусь», «Звязда», «Партызанская дубінка», «Раздавім фашысцкую гадзіну», «Партызан Гомельшчыны», «Блакнот агітатара-партызана» і інш.) і кароткай інфармацыяй з яе пра яркую падзею ваеннага часу. Нагадаць, што, акрамя перыядычных выданняў, у тыле ворага выпускаліся лістоўкі, насценныя газеты, баявыя лісткі, рукапісныя часопісы і інш. Другім пытаннем па тэме з'яўляецца знаёмства з падпольнымі друкарнямі і стваральнікамі газет. Яркі прыклад – лёс падпольшчыка Уладзіміра Амельянюка, 25-гадовага студэнта інстытута журналістыкі, які ўдзельнічаў у стварэнні падпольнай друкарні ў Мінску, быў рэдактарам падпольных выданняў, арганізаваў першы нумар падпольнай газеты «Звязда», пісаў лістоўкі, размнажаў і распаўсюджваў зводкі Савецкага інфармбюро.

Працуючы над любой, нават граматычнай тэмай, можна закранаць пытанні Вялікай Айчыннай вайны. Напрыклад, пры вывучэнні тэмаў «Сінонімы» і «Антонімы» ставяцца такія пытанні: Ці з'яўляюцца словы *халакост і генацыд* сінонімамі? Што яны абазначаюць? Тут жа закрануць сумную старонку з гісторыі апошняй вайны, растлумачыць, што ў 1960 г. з'явілася слова *халакост*, якое стала ўжывацца як сімвал масавага знішчэння яўрэйскага насельніцтва ў гады Другой сусветнай вайны. Гэтым словам сталі называць музеі, мемарыялы, прысвечаныя трагедыі яўрэйскага насельніцтва. У працах айчынных і замежных даследчыкаў масавае знішчэнне германскімі нацыстамі славянскага, яўрэйскага і цыганскага насельніцтва атрымалі назву *генацыд*. Значыць, словы *генацыд і халакост* сінанімічныя. Антонімы *гераізм і здрадніцтва* патрабуюць разгорнутай дыскусіі. На пытанні «Што такое подзвіг?», «У чым сутнасць гераізму?» адказваюць не толькі студэнты, але і прыводзяцца меркаванні В. Быкава, узятыя з яго аповесцяў «Сотнікаў», «Абеліск», «Воўчая зграя», або з твораў іншых пісьменнікаў, сацыёлагаў.

Разглядаючы абрэвіятуры, нельга абысці гісторыю Арганізацыі Аб'яднаных Нацый (ААН), паставіўшы перад студэнтамі шэраг пытанняў: Калі ўзнікла абрэвіятура? З чым гэта было звязана? Колькі краін уваходзяць у аб'яднанне? Ці уваходзіць Беларусь у ААН? Якія яшчэ краіны былога СССР уваходзяць у ААН? Якую ролю адыгрывае ААН сёння?

Вывучаючы тэму «Фразеалогія», прапануецца растлумачыць паходжанне прыказкі «Кацюша з Тагіла – фашысту магіла». У гады Вялікай Айчыннай вайны фашысты неслі вялікія страты ад рэактыўных мінамётаў, якія нашы салдаты ласкава называлі «Кацюшамі». У Ніжнім Тагіле і іншых уральскіх гарадах у гады вайны знаходзілася вялікая колькасць ваенных заводаў.

Знаёмства з мінулым свайго краю, з гераічнымі подзвігамі землякоў, анамастычныя даследаванні не толькі ўзбагачаюць веды моладзі, але і фарміруюць высокія грамадзянскія і маральныя ідэалы новага пакалення. Пра гэта сведчаць сачыненні студэнтаў 1 курса. Вось некаторыя вытрымкі з іх:

«…Цяпер я ведаю, за што магу ганарыцца сваёй Беларуссю. Наш народ шмат выцерпеў і ў змаганні за незалежнасць сваёй радзімы, сваёй мовы ў старажытныя часы, і ў барацьбе з фашызмам у гады апошняй вайны.»

«…Мая вялікая Радзіма – гэта Беларусь, мая малая Радзіма – гэта вёска Гарчаны – маляўнічы куточак Браслаўшчыны. Тут дорага мне ўсё: і рачулка з ракамі, і брусні́чнае балота, і лісічкавая сцяжынка ў лесе, і паземкавы ўзлесак.»

Толькі мэтанакіраваная праца на занятках роднай мовы будзе мець добры плён: з вывучэннем роднага краю, яго мінулага і сучаснага, з пранікненнем у асаблівасці яго мовы і культуры і ёсць выхаванне любові да Радзімы, а гэта значыць – патрыятызму.